б) 2 дм 65 см + 5 дм 9 см;
в) 8 м – 1 м 8 см;
г) 60 км – 60 м;
д) 2 км 30 м – 230 м.

Знайдзіце інфармацыю пра значэнне прыстаўкі «кіла», вызначце агульнае ў адзінках вымярэння даўжыні і масы з гэтай прыстаўкай. Даведайцеся, што азначаюць «мега», «гіга» ў словах «мегабайт», «гігабайт».

## § 6. Выяўленне натуральных лікаў на каардынатным прамені

Натуральныя лікі можна адзначыць пунктамі на прамені. Для гэтага пабудуем прамень з пачаткам у пункце *O*. Бывае, што напрамак праменя паказваюць стрэлкай (рыс. 13). Адзначым на гэтым прамені пункт *A*. Пункт *O* адпавядае ліку 0, а пункт *A* — ліку 1. Адрэзак *OA* называюць **адзінкавым адрэзкам.**




*Рысунак* 13

Такі прамень называюць **каардынатным праменем.** Каб адлюстраваць каардынатны прамень, трэба:

1) пабудаваць прамень;

2) адзначыць пачатак адліку (пункт *O*) і напрамак;

3) выбраць адзінкавы адрэзак і адзначыць лік 1.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Каб адзначыць на каардынатным прамені які-небудзь натуральны лік, трэба:**

1) ад пачатку прамяня (пачатку адліку) адкласці адпаведную колькасць адзінкавых адрэзкаў;

2) у канцы апошняга адкладзенага адрэзка паставіць зададзены лік.

На рысунку 13 пункту $B$ адпавядае лік 2, а пункту $M$ — лік 6. Лік 2 называюць каардынатай пункта $B$ і запісваюць $B(2)$, а лік 6 называюць каардынатай пункта $M$ і запісваюць $M(6)$.

**Каардыната пункта** — гэта **лік**, які адпавядае становішчу пункта на каардынатным прамені. Пункту $O$ адпавядае лік 0.

**Большы з двух лікаў** адзначаецца **на каардынатным прамені** пунктам, размешчаным **правей.**

**119.** Начарціце каардынатны прамень і адзначце на ім:

а) пункты $D(6)$, $E(9)$, $F(15)$, $H(18)$, прыняўшы за адзінкавы адрэзак адну клетку;

б) пункты $M(2)$, $N(5)$, $A(7)$, $C(10)$, прыняўшы за адзінкавы адрэзак дзве клеткі;

в) пункты $B(1)$, $T(3)$, $E(6)$, $P(8)$, прыняўшы за адзінкавы адрэзак тры клеткі;

г) пункты $K(4)$, $L(8)$, $F(12)$, $G(16)$.

**120.** Знайдзіце каардынаты пунктаў, адзначаных на каардынатным прамені (рыс. 14).




*Рысунак* 14



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**121.** Які з пунктаў $A(7)$, $B(200)$, $C(49)$ размешчаны на каардынатным прамені:

а) правей іншых;

б) лявей іншых?

**122.** Назавіце два лікі, размешчаныя на каардынатным прамені правей пункта з указанай каардынатай, і два лікі, размешчаныя лявей гэтага пункта:

а) 9; б) 17; в) 1000; г) 1111.

**123.** Назавіце які-небудзь лік, які на каардынатным прамені знаходзіцца:

а) паміж лікамі 30 і 40, размешчаны бліжэй да ліку 40;

б) паміж лікамі 600 і 700, размешчаны бліжэй да ліку 600;

в) паміж лікамі 5800 і 5900, размешчаны бліжэй да ліку 5900.

**124.** Запішыце каардынаты пунктаў, адзначаных на частцы каардынатнага праменя (рыс. 15).




*Рысунак* 15

**125.** На каардынатным прамені пунктамі адзначаны натуральныя лікі $m$, $n$, $k$ і $t$ (рыс. 16). Ці правільна, што:




*Рысунак* 16

а) $m > n$; в) $k < n$;

б) $t > n$; г) $m < t$?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**126.** На каардынатным прамені адзначаны тры лікі $a$, $b$ і $c$ так, што $a$ размешчаны лявей $b$, $b$ размешчаны лявей $c$. Параўнайце лікі $a$ і $c$.

**127.** Назавіце каардынаты некалькіх пунктаў, аддаленых на каардынатным прамені ад пункта $K(9)$ на аднолькавую адлегласць.

**128.** Запішыце лікі ў парадку ўзрастання: 312, 45, 801, 6407, 508, 907, 2009, 9731.

**129.** Знайдзіце старану прамавугольніка, калі яго перыметр роўны 122 см, а адна са старон — 34 см.

**130.** Для таго каб прыгатаваць 600 мл кактэйлю, трэба змяшаць 50 мл апельсінавага соку, дадаць на 90 мл больш яблычнага соку, маркоўнага соку ў два разы больш, чым яблычнага, а астатняе — сок сельдэрэю. Колькі мілілітраў соку сельдэрэю трэба дадаць у кактэйль?

**Правер сябе!**

Назавіце прапушчаныя словы (1, 2).

1. Каб адлюстраваць каардынатны прамень, трэба:

а) пабудаваць ... ;

б) адзначыць ... ... (пункт $O$) і ... ;

в) выбраць ... ... і адзначыць лік 1.

2. Каб адзначыць на каардынатным прамені які-небудзь натуральны лік, трэба:

а) ад ... ... (пачатку адліку) адкласці адпаведную колькасць ... ... ;

б) у канцы ... адкладзенага адрэзка паставіць ... ... .

**131.** Начарціце каардынатны прамень. Адзначце пункты:

а) $K(1)$, $M(3)$, $N(5)$, $A(6)$, $C(0)$, прыняўшы за адзінкавы адрэзак чатыры клеткі;


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

б) пункты $C(3)$, $P(6)$, $V(9)$, $S(11)$.

**132.** Запішыце каардынаты пунктаў, адзначаных на каардынатным прамені (рыс. 17).




*Рысунак* 17

**133.** Начарціце прамень з пачаткам у пункце $O$. Адступіце ад пункта $O$ ўправа тры клеткі, адзначце атрыманы пункт і падпішыце пад ім лік 3. Адзначце на каардынатным прамені лікі 1, 6, 12, 18.

**134.** Запішыце, які з двух лікаў большы, калі вядома іх размяшчэнне на каардынатным прамені:

а) лік $a$ правей ліку $c$;

б) лік $m$ лявей ліку $n$;

в) лік $k$ правей ліку 10, а лік $b$ — лявей ліку 10.

На каардынатным прамені адзначаны пункты $M(6)$ і $N(10)$. Знайдзіце каардынату сярэдзіны адрэзка $MN$. Ці можна сфармуляваць агульнае правіла для вызначэння каардынаты сярэдзіны адрэзка па каардынатах яго канцоў?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне